ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

4 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15770)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Імёны



## Валерыя ГРЫБУСАВА:

# «Пераможца ніколі не здаецца»

**У свае 20 гадоў артыстка ўжо мае багаты сцэнічны вопыт. За плячыма — конкурсныя спаборніцтвы ў Парыжы, Ялце, Санкт-Пецярбургу, Маскве. Сакрэт яе перамог часткова ў тым, што дзяўчына-максімалістка і разам з тым вельмі патрабавальная да сябе ў любой справе, за якую бярэцца. Сёлета Валерыя Грыбусава выбрана прадстаўляць Беларусь на XXIV міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2015». Мы сустрэліся з ёй, каб пагаварыць пра падрыхтоўку да конкурсу, веру ў сябе і імправізаваныя канцэрты на дачы...**

***— Літаральна праз месяц цябе чакае конкурс. На якой стадыі падрыхтоўка да «Славянскага базару»?***

— Рэпеціруем з аркестрам славянскі хіт. Яшчэ наведваю заняткі па вакале і сцэнічным маўленні. Паколькі ў мяне тры розныя кампазіцыі, то будзем і розныя вобразы ствараць. Мая першая песня «Спі, малы сакол» (на словы Янкі Лучыны і музыку Рамана Козырава) — калыханка, яе я буду выконваць у паўфінале, дзе спаборнічаць за квіток у фінал будзе 21 удзельнік, і толькі 15 пройдуць далей. Спадзяюся, і я змагу апынуцца сярод іх. А ўжо для фіналу рыхтую кампазіцыю на словы Уладзіміра Маякоўскага і музыку Давіда Тухманава «Ноч» на першы дзень, а ў якасці замежнага хіта буду выконваць «Somebody to Love», аўтарам слоў і музыкі ў ёй з'яўляецца Фрэдзі Меркуры. І, адпаведна, з Наталляй Корж мы задумалі тры розныя вобразы, якія будуць дапаўняць кожную з гэтых гісторый.

***— У якасці песні для паўфіналу ты выбрала калыханку. А табе ў дзяцінстве часта спявалі перад сном альбо чыталі казкі?***

— Калыханкі спявала маці. Казкі ж мне чытала мая прабабуля. Часам яна нават сама іх складала.

*Але ні з адным з персанажаў, гісторыі якіх Валерыя слухала перад сном, яна сябе не атаясамлівала. Бо сёння яна піша сваю казку, у якой галоўная гераіня — гэта дзяўчына-змагарка. Яна верыць у сваю мару і нічога не баіцца. І мне становіцца цікава: а за што, акрамя прызавых месцаў на сцэне, даводзілася змагацца нашай гераіні ў жыцці?*

— Я з дзяцінства заўсёды хацела быць ва ўсім самай лепшай і імкнулася зрабіць максімум для гэтага.

***— Ці не абумоўлена тваё жаданне «быць лепшай» тым, што бацька ў свой час пакінуў сям'ю?***

— Мне даводзілася і даводзіцца быць моцнай. Безумоўна, маці ва ўсім мне дапамагала і цяпер падтрымлівае. Я па-філасофску ўспрымаю той факт, што ў маіх бацькоў не склаліся адносіны. З татам мы падтрымліваем сувязь, але кантактуем даволі рэдка. Магчыма, маё жаданне быць лепшай і бярэ пачатак якраз у гэтых абставінах...

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

SEX=БАЛЯСЫ

# ШАРМУ — АД ПУЗА!

**Ну вось і пражыла краіна чарговае «Еўрабачанне»... Жыццё пакрысе зноў наладжваецца, уваходзіць у спакойнае рэчышча... Тым больш наперадзе — такое доўгачаканае лета. Дарэчы, вы заўважылі, як змяніліся вуліцы нашых гарадоў і вёсак з першымі павевамі цяпла, калі ўсе нарэшце распрануліся? На іх з'явілiся тысячы маладых і прыгожых... Не, не жанчын — досыць гэтых гендарных стэрэатыпаў. Мужчын. Якія, як ніколі раней, сустрэлі чарговы летні сезон у «поўным узбраенні». Як, вы не разумееце, пра што гаворка? Не чулі гэтую навіну? Новы трэнд года, які імкліва набывае сусветную папулярнасць, — невялікі пузік у прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва. Так-так, вы ўсё правільна зразумелі: не кубікі натрэніраванага прэса, а такі невялічкі «піўны мазалёк» (вядома, пенны напой неабавязкова можа быць яго прычынай). Алілуя! Мабыць, так усклікнулі тыя з мужчын, якія любяць па выхадных займацца нерухомасцю. У сэнсе, ляжаць на канапе і не рухацца. («І што такое на мяне ўчора найшло? Перад халадзільнікам дагэтуль сорамна».)**

Усё пачалося з таго, што ў інтэрнэце з'явіўся артыкул амерыканскай студэнткі. Дзяўчына неабачліва напісала пра асаблівую прывабнасць мужчын з жыватом, якія не вельмі моцна сочаць за сабой. Не тое, каб гэта было сапраўднае абвіслае піўное пуза, а, як яна адзначыла, прыемны баланс паміж ім і пляскатым жыватом. («У цябе прыгожая лінія падбародка». — «Дзякуй. Я многа жую».) Такая фігура, на думку аўтаркі, гаворыць пра тое, што хлопец усё ж час ад часу займаецца ў трэнажорнай зале, аднак не робіць з гэтага культу, не імкнецца да нейкай фізічнай дасканаласці. Наадварот, ён можа ў сваё задавальненне дазволіць у выхадны



Фота Надзеі БУЖАН.

дзень з'есці вялікую піцу і не турбавацца, што папраўіцца. («Брытанскія вучоныя высветлілі, што маленькія талеркі ратуюць ад пераядання. Але толькі лянівых і някемлівых».) «Такога спадарожніка, — развівае далей сваю тэорыю студэнтка, — прыемна абдымаць, з ім камфортна вячэраць». («Хачу, каб хто-небудзь прымушаў мяне да дзеянняў сексуальнага характару, пагражаючы гарачай зброяй. Пажадана — галубцамі са смятанай».)

Маладая каляжанка (між іншым, інструктар па фітнесу ў вольны ад асноўнай працы час) напачатку не паверыла навіне пра новы трэнд. А калі пераканалася, што гэта не падман, першай яе рэакцыяй было: «А фота аўтаркі артыкула ёсць? Можа, яна не вельмі прыгожая і такім чынам «заніжае планку»?» («Жаночая мудрасць у сукупнасці з жаночай хітрасцю даюць такі эфект, які не можа даць ніводная вышэйшая адукацыя».) І мела рацыю! Фотаздымка амерыканскай студэнткі мы не знайшлі. Але аўтарка тэорыі прызналася, што выгляд мужчыны з пузікам лічыць ідэальным, таму што побач з такім спадарожнікам дзяўчыне не трэба самой выглядаць бездакорнай. («Гэты непрыемны момант... Ты, які кінуў курыць, цішком уначы крадзешся на кухню, каб пакурыць у фортку, і сустракаеш жонку, якая села на дыету, каля адкрытага халадзільніка з батонам каўбасы ў руках...») Так ужо павялося, што часта жанчыны хочуць глядзецца прыгажэйшымі за сваіх мужчын, каб адчуваць сябе больш упэўнена. Пры гэтым менавіта хлопцы з пузікамі дапамагаюць звыкнуцца з тым, як яны будуць выглядаць у сталым узросце, і не падманваюць часовай падцягнутасцю. Дарэчы, тая ж каляжанка праз некалькі дзён са здзіўленнем у голасе канстатавала, што амаль ва ўсіх яе сябровак бой-фрэнды менавіта такога «топавага» тыпажу. Бачыце, нашы дзяўчаты яшчэ раней ацанілі ўвесь шарм «брэндавых» хлопцаў!

Пажартавалі, вядома. Але, думаю, доля ісціны ў тым ёсць. Інакш чаму мог узнікнуць новы трэнд, чаму ён так хутка набыў папулярнасць, што яго абмяркоўваюць у вядучых сусветных сродках масавай інфармацыі? У сеціве пачалі нават складаць адмысловыя топ-рэйтынгі славутасцяў, якіх можна назваць «іконамі новага стылю». Гэта, напрыклад, Леанарда Дзі Капрыа, Расел Кроў, Адам Сэндлер — вядомыя галівудскія «зоркі», якія за апошні час абзавяліся «піўнымі пузікамі». Але не будзем цешыць сябе тым, што адгадаваў жывоцік — і ты на іх узроўні. («Сціпласць упрыгожвае мужчыну. Але сапраўдны мужчына ўпрыгажэнняў не носіць».) Тут, прабачце, яшчэ і талент мець трэба. З іншага боку, магчыма, дзяўчаты стаміліся ад таго, што хлопцы пачалі занадта шмат часу надаваць самім сабе і сваёй знешнасці. Гэтую версію патрымаў адзін з калумністаў, які распавёў, што цягам дзесяці гадоў не вылазіў з трэнажорнай залы, аднак бездакорная форма не толькі не зрабіла яго больш прывабным для жанчын, але нават пачала адпужваць іх. Яны маглі бясконца хваліць біцэпсы, але не імкнуліся да доўгатэрміновых адносін з мужчынам. («Людзі, якія па выхадных прачынаюцца ў шэсць, едуць на велапрагулкі, пікнікі... Вы што ўжываеце? Я ледзьве ўстаю з ложка, і тое пасля абеду». Затое потым... «Я выспаўся. Цяпер я бяспечны для грамадства».)

Гэта ніякае не апраўданне ляноты і нежадання займацца спортам. («Найлепшы спосаб падняць чалавека ранкам — гэта кава ў ложак. Выліў — і ўцякай!».) Паслухайце песню Сямёна Слепакова «Мора работы», дзе ёсць словы «праца працай, але час ад часу трэба працаваць». Вось я зараз дапішу гэтыя радкі і... «Адкрылася самая вялікая трэнажорная зала... Агарод!» Галоўнае — не страціць на ім свой шарм зусім!..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Пераможца ніколі не здаецца»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Цяпер я жыву адна і дома мяне ніхто не чакае. Я яшчэ не сустрэла свайго чалавека. Хлопец, якога я ўяўляю побач з сабой, павінен быць упэўненым у сабе і ведаць, чаго ён хоча дасягнуць у жыцці. Немалаважна і тое, каб ён падтрымліваў мяне ў імкненні займацца любімай справай. Мне патрэбен той, хто стане маёй «каменнай сцяной».

*Пакуль што, прызнаецца юная спявачка, часу хадзіць на спатканні зусім няма. Дзяўчына сумяшчае вучобу ва Універсітэце культуры і мастацтваў з працай у Нацыянальным аркестры Міхаіла Фінберга (жыццё там — гэта пастаянныя рэпетыцыі, гастролі), а цяпер яшчэ і рыхтуецца да «Славянскага базару».*

***— Скажы, а як ты расцэньваеш свае перамогі на конкурсах?***

— Заўсёды адказна рыхтуюся і настройваюся на добры вынік. Але калі ўдаецца заваяваць першае месца ці гран-пры, то заўсёды прысутнічае момант прыемнага здзіўлення. А наогул мой дэвіз па жыцці: пераможца ніколі не здаецца. Імкнуся да сур'ёзных вынікаў, але не загадваю, што атрымаецца. Наогул, талент ніколі не гарантуе поспеху, таму што важна, колькі ты гатовы працаваць дзеля яго.

*Наўрад ці магла Валерыя некалі прадбачыць сваю перамогу на рэспубліканскім конкурсе маладых выканаўцаў «Маладзечна—2013». Аднак узяла гран-пры, і яе заўважыў Міхаіл Фінберг, запрасіўшы супрацоўнічаць. Музычнай пачала займацца, як і многія, у дзяцінстве. Спачатку ў ансамблі народнай музыкі «Ярыца», потым у Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі-каледжы мастацтваў. Быў нават час, калі дзяўчына наведвала Студыю Сяргея Нагорнага, спасцігаючы ў яе сценах акцёрскае майстэрства, харэаграфію і іншыя дысцыпліны.*

— Яшчэ задоўга да таго, як пачала вывучаць нотную грамату, спрабавала спяваць і цягнулася да фартэпіяна. Уяўляла сябе артысткай. Нават на дачы збірала бабуль, дзядуляў і іх унукаў і ладзіла ім імправізаваныя канцэрты. А мая маці, заўважыўшы такі інтарэс да музыкі, аддала мяне ў ансамбль. Былі перыяд, калі ў пятым класе я прыйшла ў гімназію, а там былі дзеці, якія да гэтага ўжо на працягу пяці гадоў вывучалі сальфеджыа і іншыя дысцыпліны, і я за два гады змагла дагнаць іх. Праўда, з той пары вольнага часу амаль не было.

***— Кажуць, што дысцыпліна і творчасць не заўсёды сумяшчальныя. Ты — прыклад, які абвяргае такое меркаванне?***

— Што датычыцца дысцыпліны, то ў гэтым вялікая заслуга Міхаіла Якаўлевіча Фінберга. У нас вельмі жорстка караюцца спазненні на канцэрт і рэпетыцыі. Наогул дысцыпліна — гарант добрай працы. Я вельмі ўдзячная свайму кіраўніку за тое, што ён верыць у мяне і падтрымлівае.





***— Як сябры рэагуюць на тваё захапленне музыкай?***

— У мяне мала сяброў. Але тыя, хто са мной ідзе па жыцці, ставяцца да гэтага з разуменнем, і ніхто не крыўдзіцца, калі, скажам, з-за чарговага конкурсу я не магу прыйсці на чыйсьці дзень нараджэння.

***— А твая малодшая сястра, гледзячы на цябе, не кажа бацькам пра жаданне займацца музыкай?***

— Кіра — мая самая адданая прыхільніца, яна ведае на памяць усе мае песні. І сама часта спявае. Айчым сказаў неяк, што нам і адной спявачкі ў сям'і дастаткова. Аднак, калі мы з сястрой сустракаемся, то вельмі любім і спяваць, і танцаваць пад гучную музыку, чытаем разам кніжкі...

Некалі хацела брата. Памятаю, калі даведалася, што будзе сястра, то моцна пакрыўдзілася на бацькоў і тыдні два, мабыць, з імі не размаўляла. Цяпер жа нават не ведаю, як бы я жыла без яе. Думаю, калі яна падрасце, мы станем найлепшымі сяброўкамі. А можа і яна пойдзе маім шляхам.

**«Яшчэ задоўга да таго, як пачала вывучаць нотную грамату, спрабавала спяваць і цягнулася да фартэпіяна. Уяўляла сябе артысткай. Нават на дачы збірала бабуль, дзядуляў і іх унукаў і ладзіла ім імправізаваныя канцэрты».**

***— Для сябе ты бачыш перспектыву толькі на сцэне?***

— Так. І нават не ўяўляю, чым бы яшчэ магла займацца. У школе я мела здольнасці да вывучэння замежных моў, таму, магчыма, разглядала б яшчэ такі варыянт. Дзядуля мой хацеў, каб я паступіла на міжнародныя адносіны, а ў выніку я выбрала музыку... У мяне маці вельмі творчы чалавек, хоць і працуе ўрачом. Калі танцавала ў ансамблі, то часта брала мяне на рэпетыцыі. Яна ў мяне артыстка яшчэ тая! Я хацела б навучыцца ў яе ўменню падаваць сябе на сцэне, бо сёння я толькі ў пошуку сябе.

***— Да публічнасці, якая з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця артысткі, ты гатова?***

— Мець жыццё, дзе ты цікавы іншым і твой час распісаны па гадзінах, — адна з маіх мар. Сказаць, ці гатова я да такога раскладу, мабыць, не змагу, пакуль не адчую наступстваў. Як і ўсім артыстам, мне хочацца быць запатрабаванай у публікі і стаць годнай артысткай, каб мая музыка была цікавая людзям, каб яны пачулі мае гісторыі...

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12. 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.117.
Нумар падпісаны ў 19.30 03.06.2015 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ